# 2024 год

# ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ

Звесткі з архіва
Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі

*Кніга, як і чалавек, мае дату нараджэння – год, калі яна ўпершыню была апублікавана. І, канешне, у кніг бываюць юбілеі, а яны, як вядома, з’яўляюцца своеасаблівымі каталізатарамі ўспамінаў і служаць нагодай для таго, каб звярнуць увагу на выдатныя старонкі гісторыі літаратуры і кнігадрукавання і ўвогуле ацаніць «базу даных» культурнай спадчыны, асэнсаваць яе ўнікальнасць.*

*У гэтай рубрыцы прадстаўлена інфармацыя аб мастацкіх творах класікаў беларускай літаратуры, першыя выданні якіх захоўваюцца ў архіве Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі і для якіх 2024 год з’яўляецца юбілейным.*

# 60 гадоў

**Брыль, Я. Птушкі і гнёзды : кніга адной маладосці / Янка Брыль. – Мінск : Беларусь, 1964. – 345, [2] с.**




«Птушкі і гнёзды» Янкі Брыля (1917–2006) – экспрэсіўна-лірычны эксперыментальны раман, у якім, па вызначэнні даследчыцы Ганны Альштынюк, «факты прыватнага жыцця пісьменніка набылі ўніверсальнае абагульненне і натуральна спалучыліся з мастацкім вымыслам». Аповед у рамане вядзецца ад імя галоўнага героя Алеся Руневіча, паказваецца яго ўнутраны стан і тыя змены, што адбываюцца ў светаадчуванні пад уздзеяннем рэчаіснасці. Гэтым раман кантрастуе з падзейнымі і шматгеройнымі творамі савецкай літаратуры.

Напісанне «Птушак і гнёздаў» было расцягнутым у часе. Першыя часткі пісаліся ў перыяд з 1942 па 1944 гады. Але потым рукапіс быў адкладзены. Да яго аўтар здолеў вярнуцца ажно праз 20 гадоў. З 1962 па 1964 год раман дапрацоўваўся, друкаваўся ў часопісе «Полымя» (1963), а ў 1964 годзе выйшаў асобнай кнігай у выдавецтве «Беларусь» тыражом 8000 экзэмпляраў.

Раман «Птушкі і гнёзды» перавыдаваўся (1975, 1989) і ўключаўся ва ўсе зборы твораў і выбраныя творы Янкі Брыля (1968, 1980, 2001, 2006, 2020). Перакладзены і выдадзены на рускай, украінскай, чэшскай, латышскай, нямецкай  мовах.

# «Птушкі і гнёзды» : 60 гадоў



Раман «Птушкі і гнёзды» аўтабіяграфічны. Сам Янка Брыль з першых дзён Другой сусветнай вайны ваяваў пад Гдыняй, быў кулямётчыкам. Трапіў у палон, восенню 1941 года здолеў уцячы на радзіму, дзе стаў сувязным партызанскай брыгады імя Жукава Баранавіцкага злучэння, а ў 1944 годзе – разведчыкам партызанскай брыгады «Камсамолец».

Аналагічныя выпрабаванні выпадаюць і на долю галоўнага героя рамана Алеся Руневіча, высакароднага і прыгожага юнака з заходнебеларускай вёскі Пасынкі. Ён вымушаны служыць у польскім войску. Калі на Польшчу напала фашысцкая Германія, Алесь трапіў у палон, дзе зведаў цяжкую фізічную працу, бачыў і сам перажыў здзекі, голад і душэўныя пакуты. Аповед пра жыццё ў фашысцкім палоне пастаянна перапыняецца ўспамінамі героя пра дзяцінства і родную Беларусь. Юнак спрабуе ўцячы з палону, але гэта ўдаецца толькі з другога разу. Праз Германію і Польшчу герой дабіраецца да роднага сяла. На радзіме, у СССР, дзе ўжо палае Вялікая Айчынная вайна, Алесь наладжвае сувязь з партызанамі, потым і сам сыходзіць у лес, паказвае сябе адважным разведчыкам; затым, як чалавек пішучы, накіроўваецца камандаваннем у рэдакцыю партызанскай газеты. Савецкім журналістам на ўжо вызваленай роднай зямлі ён і заканчвае вайну.

# «Птушкі і гнёзды» : 60 гадоў

**Цікавыя факты аб рамане**.

●Да Янкі Брыля ніхто з савецкіх пісьменнікаў не пісаў пра жыццё ў фашысцкай Германіі да нападзення яе на СССР.

●Тэкст «Птушак і гнёздаў» у кніжным выданні значна карацейшы за тэкст рамана ў часопісным варыянце («Полымя», 1963).

●У аснову рамана пакладзены аповесці «Сонца праз хмары» і «Жывое і гніль», напісаныя Янкам Брылём адразу па вяртанні на радзіму з палону.

●Звыш 50 старонак у рамане займаюць успаміны героя пра маці, лірычныя звароты да яе, а таксама матчыны ўспаміны-ўстаўкі.

●Адзін з эпізадычных герояў рамана – паэт Сяргей Крушына. Яго прататыпам быў заходнебеларускі паэт Міхась Васілёк, які працаваў у лагерным паштова-пасылачным пункце, калі з ім сустрэўся палонны Янка Брыль.

●Прататыпам чулай пані Ванды, разумнай і добрай пакравіцелькі юнага Алеся Руневіча, стала любімая настаўніца літаратуры будучага пісьменніка Мар’я Пранеўская.

●У тэксце твора гаворыцца пра невядомы лёс Сяргея Руневіча, пад імем якога аўтар «схаваў» свайго брата Уладзіміра Брыля. Ён быў расстраляны ў 1938 годзе ў лесе кіеўскай Быкоўні. Пра гэта Янка Брыль расказаў у дакументальнай аповесці «Муштук і папка» (1990).